М. І. НАВУМЧЫК,
настаўнік-метадыст, намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце Маларыцкай раённай гімназіі, член савета асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў Рэспублікі беларусь «Імкненне».

# Вывучэнне паэмы Янкі Купалы «Бандароўна» ў 9 класе

Мэты:

– спрыяць паглыбленню ведаў вучняў пра творчую спадчыну Янкі Купалы, паказаць фальклорную першакрыніцу паэмы;

– раскрыць ідэйны змест паэмы, паказаць яе сувязь з фальклорам, дапамагчы ўбачыць асаблівасці адлюстравання рамантычнага героя;

– развіваць маналагічную мову, уменне аналізаваць літаратурны твор, праводзіць паралелі, інтэрпрэтацыі паэмы ў розных відах мастацтва: садзейнічаць выхаванню пачуцця ўласнай годнасці.

Міжпрадметныя сувязі: айчынная і сусветная мастацкая культура.

Абсталяванне:

1. Сімфонія Г. К. Гарэлавай «Бандароўна»;

2. Аўдыёзапіс паэмы «Бандароўна» (чытае Уладзімір Міронччык) http://budzma.by/news/yanka-kupala-paema-bandarowna-awdyyazapis.html;

3. Фотаздымкі Свята-Успенскай Пачаеўскай Лаўры, інтэрнэт-рэсурсы : http://h.ua/story/337489, http://elib.grsu.by/katalog/177243-408830.pdf, http://venividi.ru/node/10156.

## ХОД УРОКА

**І. Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.**

**ІІ. Праверка дамашняга задання.**

**ІІІ. Мэтавызначэнне.**

**ІV. Вывучэнне новага матэрыялу.**

Гучыць беларуская народная песня пра Бандароўну, затым – аўдыёзапіс паэмы «Бандароўна» (чытае Уладзімір Міронччык).

У чэрвені 1913 г. у Акопах Янка Купала завяршыў работу над стылізаванай фальклорна-рамантычнай, ліра-эпічнай паэмай «Бандароўна», якая была створана на аснове рэальных гістарычны падзей і па матывах беларускіх і ўкраінскіх народных песень. У аснову твора аўтар паклаў адну з іх, якая мае назву «Ой чаму ж ты, пан Хаміцкі, у той час не жаніўся», якая была запісана Паўлам Шэйнам. Але першым, хто апублікаваў баладу пра Бандароўну, быў Ян Чачот. Яе таксама ў свой час запісалі і Іван Насовіч, Уладзіслаў Вярыга, Міхась Федароўскі, Яўхім Карскі, Рыгор Шырма.

Як распаўсюджвалася балада пра Бандароўну на тэрыторыі Беларусі?

«Геаграфія беларускіх запісаў балады паказвае, што песня «выбрала» найбольш зручны шлях: з Валыні праз Заходняе Палессе з яго пераходнымі гаворкамі на Гродзеншчыну, дзе мела найбольшае пашырэнне, далей да Маладзечна, Мінска. З Гродзеншчыны «Бандароўна» павандравала на поўнач у літоўскія землі, у Сувалкію і нават за Нёман, за Каўнас – у Жэмайцію. …У каталозе літоўскіх балад… зарэгістравана каля 30 варыянтаў гэтага сюжэта менавіта з названых мясцін. …У Закарпацці балада жыве ў народным рэпертуары і зараз. Гэты факт сведчыць пра большую жыццяздольнасць твора на роднай глебе» [8, с. 176 – 177].

− Галоўным героем твора з’яўляецца пан Патоцкі. Якім ён паўстае на старонках паэмы?

З паэмы Мікалай Патоцкі паўстае як рамантычны злачынец, як спакуснік. Ён разбэшчаны, ганарлівы, спустошаны чалавек, пагардлівы ў адносінах да людзей, бязлітасны прыгнятальнік, тыран, дэспат, феадал-самадур, бесчалавечны, люты эксплуататар, які «ні старому, ні малому не спускае жартаў». Патоцкі «вольна чыніць над людзьмі любое зло» (Любоў Тарасюк).

− Ці існаваў рэальны пан Патоцкі? Што гэта быў за чалавек?

У сярэдзіне XVIII стагоддзя жыў у сваім маёнтку ля Любліна адзін радавіты багаты вельможа граф Патоцкі (1712 − 1782). Сваё прозвішча ён атрымаў па назве вёскі Залаты Паток. Звалі графа яшчэ і Канеўскім, бо быў старастам г. Канеў (цяпер раённы цэнтр Чаркаскай вобласці Украіны). Мікалай Патоцкі ў той час увасабляў у сабе горшыя рысы польскай арыстакратыі. Вёў разгульнае жыццё, жорстка абыходзіўся з народам, крыўдзіў яго. Быў ён горды, бязлітасны, свавольны да шаленства, апанаваны духам злобы і чалавеказабойства. Мог не толькі прыбіць, але і забіць каго хочаш, а за яўрэямі ездзіў на паляванне як за дзічынаю.

Эксцэнтрычнаму Патоцкаму быў характэрны злачынны звычай: «сустрэўшы прыгожую дзяўчыну, ён прымусам браў яе замуж, вянчаўся, а нацешыўшыся ахвярай, забіваў яе і наладжваў пышнае пахаванне».

Але ўсяму бывае канец. Аднойчы Патоцкі ехаў у калясцы непадалёк ад Пачаева. (Настаўнік паказвае фотаздымкі Свята-Успенскай Пачаеўскай Лаўры.) На дарозе нешта здарылася: коні рванулі ўбок, перакуліўшы каляску. Граф упаў на зямлю. Не такім быў чалавекам Мікалай Патоцкі, каб адкладваць свой гнеў да высвятлення абставін таго, што здарылася. З лаянкаю ён выхапіў пісталет з-за пояса. У гэты час фурман зразумеў, што наступіла апошняя хвіліна яго жыцця. Толькі і паспеў ён павярнуцца ў бок

манастыра, які віднеўся на гары і ўсклікнуць: «Маці Божая, дзівосная ў абразе Пачаеўскім, выратуй мяне...»

Выстрал − асечка. Другі − зноў асечка. Трэці выстрал – і зноў асечка. Разгневаны Патоцкі збянтэжана глядзіць на свой пісталет, які ніколі не падводзіў яго...

Што гэта за абраз Пачаеўскі, у якога прасіў паратунку фурман? Граф хоча бачыць яго зараз жа і едзе ў Пачаеў. Мікалай Патоцкі ўваходзіць у храм, бачыць абраз і са слязьмі, пакаянай малітвай падае на калені перад цудадзейнай выявай Царыцы Нябеснай...

У 1774 г. граф на свае сродкі пабудаваў царкву святой Варвары, а ў 1781 г. − Успенскі сабор.

…Бандароўны не стала. Натуры ўзвышанай, вытанчанай. Яна з’яўляецца галоўным героем. Дык хто ж такая Бандароўна?

Бандароўна – дачка казака Бандарэнкі з мястэчка Берастэчка.

− Зачытайце партрэтную характарыстыку галоўнай гераіні.

Сваю гераіню аўтар малюе яркімі фальклорна-казачнымі фарбамі (зачытваецца другі раздзел паэмы). Са знешняй прыгажосцю дзяўчыны гарманіруе яе ўнутранае хараство. Гераіня паэмы — збіральны вобраз, носьбіт сапраўднай свабоды духу.

− Якія рысы характару ўласцівы дзяўчыне?

Вобраз Бандароўны ў творы ідэалізаваны. Яна смелая, валявая, мужная, бескампрамісная, вольналюбівая, вясёлая, жыццярадасная, непадкупная, непакорная, мае дзявочы гонар і чалавечую годнасць, цэніць свабоду. Бандароўне характэрна маральная чысціня, духоўная цэльнасць, унутраная незалежнасць.

− Якою вы ўяўляеце Бандароўну? Параўнайце яе з партрэтам, які зроблены мастаком (https://yandex.by/images/search?img_url).



− З дапамогаю якіх вобразна-выяўленчых сродкаў аўтар стварае запамінальны вобраз (партрэт) гераіні?

Бандароўна на ўвесь свет славіцца сваёй прыгажосцю. Каб гэта паказаць, Янка Купала ўжывае эпітэты, метафары, параўнанні, гіпербалы, сімвалы, паўторы, паралелізм, кантраст...

− Чаму Бандроўна адказвае Патоцкаму так:

Чым з табою піць, гуляці, −  
Ночкі каратаці,−  
Лепш навекі косці парыць  
У зямельцы-маці!

Дзяўчына не дазволіла абыходзіцца з ёю так, як хацеў Мікалай Патоцкі. Бандароўна не можа здрадзіць сабе, свайму сумленню, не хоча прадаваць сваю «чэсць і славу». Яна вельмі цаніла свабоду, таму і не змагла б жыць у няволі.

− Што паказаў Янка Купала праз вобраз Бандароўны?

Аўтар здолеў паказаць мужнасць усяго беларускага народа, чалавечую годнасць і духоўную моц простага чалавека.

− Што ўвасабляе Бандароўна?

Яна − ідэал чалавека, які да канца адданы свайму народу і радзіме, увасабляе праўду, сумленне, хараство чалавечай душы, маральную чысціню.

− Бандароўна не адзіночка-бунтар. Яна разумее сваю еднасць з народам. Пацвердзіце гэту думку радкамі з паэмы.

Адказ знаходзім у восьмым раздзеле: «За мной праўда і народ мой, за табой – грошы!»

− У якіх радках паэмы з асаблівай сілай раскрываецца гераічны характар галоўнай гераіні?

Зачытваецца апошняя страфа восьмага раздзела.

− Чым стала расправа над Бандароўнай?

Смерць дзяўчыны стала той іскрай, з якой разгарэлася полымя народнага гневу. У 1768 г. на Украіне адбылося казацкае паўстанне пад кіраўніцтвам Максіма Жалезняка і Івана Гонты супраць польскіх паноў-прыгнятальнікаў. Смерць Бандароўны − гэта яшчэ і «ўрок мужнасці і гераізму, смелы выклік беззаконню, дэспатызму, сацыяльнай несправядлівасці» (Васіль Івашын).

− Што ўвасабляе Мікалай Патоцкі ў творы?

Патоцкі − гэта ўвасабленне грубай сілы, жорсткасці, амаральнасці, агіднасці, багацця, улады.

− Што ўяўляе з сябе кампазіцыя паэмы?

Твор складаецца з 12 раздзелаў, якія паміж сабою звязаны адзінствам дзеяння. Аповед чаргуецца з аўтарскімі апісаннямі, дыялогам, пейзажнымі замалёўкамі, лірычнымі адступленнямі.

I-II раздзелы − экспазіцыя,
III раздзел − завязка,
IV-VIII раздзелы − развіццё дзеяння,
IX раздзел − кульмінацыя,
X-XI раздзелы − развязка,
XII раздзел − эпілог.

−

Якая роля пейзажу ў творы?

Пейзаж дапамагае глыбей раскрыць пачуцці і перажыванні гераіні ў самую цяжкую хвіліну яе жыцця.

− Назавіце асаблівасці паэмы.

Асаблівасцей некалькі:

1. лірычныя звароты цесна звязаны з сюжэтам;
2. героем твора з’яўляецца сам аўтар;
3. пейзаж пранікнуты лірызмам;
4. песеннасць;
5. твор падзелены на раздзелы;
6. народна-паэтычная аснова;
7. паэма напісана чатырохрадковай страфой (катрэнам).

− Чаму «Бандароўну» адносяць да ліра-эпічнай паэмы?

У творы расказваецца пра жыццё і трагічную смерць галоўнай гераіні. Гэты аповед чаргуецца з лірычнымі адступленнямі…

− На якой падставе гэту паэму адносяць да рамантычнай?

Твор створаны на фальклорнай аснове, мае гераічную тэматыку; выключны галоўны герой трагічна гіне ў фінале.

(Вучні слухаюць сімфонію Г. К. Гарэлавай «Бандароўна» (1986 г.). Лепш гэта зрабіць загадзя, а на ўроку слухаюцца толькі асобныя ўрыўкі з музычнага твора.)

Пытанні:

1. Якое ў вас уражанне ад сімфоніі?
2. Якія зрокавыя вобразы ўзніклі пасля праслухоўвання?
3. Якая танальнасць гучання на працягу сімфоніі? Чаму?
4. У сімфоніі яўна ўлаўліваецца гучанне скрыпкі. Што яна сімвалізуе?
5. Якімі вам уяўляецца Бандароўна і Патоцкі з паэмы і сімфоніі? Абгрунтуйце.
6. Што агульнае адлюстравана ў паэме і сімфоніі?

(У творах адлюстравана барацьба дабра і зла, волі і прымусу, чалавечнасці і зверства.)

**V. Абагульненне і замацаванне.**

1. Чым захапляе нас вобраз Бандароўны ў творы?
2. Даследчыкі вызначаюць жанр «Бандароўны» яшчэ як і паэма-балада, паэма-песня. Чаму?
3. Ахарактарызуйце час, у які адбываюцца падзеі ў «Бандароўне».

Дзеянне ў паэме аўтар пераносіць у сярэдзіну XVIII стагоддзя. Гэта быў бяспраўны, жудасны час. Народ цярпеў нацыянальны і феадальны гнёт.

4. Раскажыце аб сувязі паэмы з фальклорам.

Паэма звязана з фальклорам не толькі зместам, але і мастацкай формай. Твор напісаны ў народна-песенным стылі. У паэме прысутнічаюць народныя сімвалічныя вобразы. Многія эпітэты, параўнанні, словы-сімвалы запазычаны з вуснай народнай творчасці.

5. Ці можна пагадзіцца з думкаю, што Патоцкі «бездапаможны перад сілай духу Бандароўны»? Чаму?

6. Чаму паэма «Бандароўна» актуальна і ў наш час? Абгрунтуйце.

7. Выкананне тэставага задання па паэме [1].

**VI. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.**

**VII. Магчымыя варыянты дамашняга задання (на выбар вучняў).**

1. Скласці цытатны план паэмы.
2. Вобраз Бандароўны ў творы.
3. Лірычныя звароты і вобраз паэта-апавядальніка ў паэме «Бандароўна».
4. Выразнае чытанне твора.
5. Скласці план паэмы, умець па плане пераказваць яго змест.
6. Напісаць сачыненне на тэму «Бандароўна − пуцяводны маяк для сучаснай моладзі».
7. Скласці карту распаўсюджвання балады пра Бандароўну.
8. Вывучыць на памяць урывак з паэмы.
9. Запоўніць табліцу «Параўнальная характарыстыка Бандароўны і Патоцкага».

| Бандароўна | Патоцкі |
|---|---|
| 1.<br>2.<br>3. … | 1.<br>2.<br>3. … |

Літаратура

1. Бярозкін, Р.С. Свет Купалы. Звенні: літаратурная крытыка: выбранае / Р. С. Бярозкін. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. – С. 104-106.

2. Гніламёдаў, У. В. Янка Купала: новы погляд: дапам. для настаўнікаў / У. В. Гніламёдаў. – Мінск, Нар. асвета, 1995. – С. 87-91.

3. Грамадчанка, Т. К. Беларуская літаратура: школьныя творы: кароткі змест і аналіз / Т. К. Грамадчанка. – 7-е выданне. – Мінск, 2006. – С.137–139.

4. Драўніцкі, І. П. Вобраз Бандароўны ў паэме Я. Купалы і яго інтэрпрэтацыя ў іншых відах мастацтва / І. П. Драўніцкі // Роднае слова. − 1995. − № 7. − С. 94–102.

5. Лявонава, П.І. Беларуская літаратура ў пытаннях і адказах: 9-ы кл.: дапам. для насттаўнікаў установ, якія забяспечваюць атрымане агул. сярэд.

адукацыі, з беларус. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання / П. І. Лявонава, Л. Я. Цвірко. – Мінск: УніверсалПрэс, 2006. – С. 144–146.

6. Навуменка, І. Я. Янка Купала: духоўны воблік героя / І. Я. Навуменка; [навук. рэд. Д. Я. Бугаёў]. – Мінск: Выш. школа, 1967. – 219 с.

7. Навумчык, М. І. Вывучэнне паэмы Янкі Купалы «Бандароўна»: (IX клас) / М. І. Навумчык // Беларуская мова і літаратура. − 2007. − № 1. − С. 26–28.

8. Салавей, Л. М. Беларуская народная балада / Л. М. Салавей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 192 с.

9. Старычонак, В. Д. Беларуская літаратура: ад А да Я. У дапамогу абітурыентам і школьнікам / В.Д.Старычонак. – Мінск: Выш. шк., 1998. – С. 57–59.

10. Тарайковіч, А. А. Беларуская літаратура: кароткі змест і аналіз твораў: школьны курс / склад. А. А.Тарайковіч. – Мінск: Юнипресс, 2010. – 101–103.